# *§ 60–0. Сацыяльная палітыка ў сучаснай Беларусі

САЦЫЯЛЬНАЯ ПАЛІТЫКА
САЦЫЯЛЬНА АРЫЕНТАВАНАЯ ЭКАНОМІКА СІСТЭМА АДУКАЦЫІ
САЦЫЯЛЬНАЯ ДАПАМОГА
АХОВА ЗДАРОЎЯ
МАЛАДЗЁЖНАЯ ПАЛІТЫКА

Сацыяльна арыентаваная дзяржава

**1. Рэспубліка Беларусь — сацыяльна арыентаваная дзяржава.** У аснове сацыяльнай палітыкі Рэспублікі Беларусь ляжыць клопат пра чалавека і яго дабрабыт. У адпаведнасці з Канстытуцыяй чалавек, яго правы, свабоды і гарантыі іх рэалізацыі з'яўляюцца найвышэйшай каштоўнасцю і мэтай грамадства і дзяржавы; кожны мае права на годны ўзровень жыцця, у тым ліку на дастатковае харчаванне, адзенне, жыллё і пастаяннае паляпшэнне неабходных для гэтага ўмоў.

Прыярытэты сацыяльнай палітыкі Рэспублікі Беларусь

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнка вызначыў галоўную стратэгічную мэту сацыяльнай палітыкі — павышэнне жыццёвага ўзроўню беларускага народа.

У суверэннай Беларусі распрацоўваюць і рэалізоўваюць дзяржаўныя праграмы, накіраваныя на развіццё аховы здароўя, адукацыі, будаўніцтва жылля і інш. («Здароўе народа і дэмаграфічная бяспека», «Адукацыя і маладзёжная палітыка», «Будаўніцтва жылля», «Дарогі Беларусі» і інш.).

Рэалізацыя сацыяльнай палітыкі Рэспублікі Беларусь

Наша рэспубліка займае адну з першых пазіцый сярод краін СНД па забяспечанасці насельніцтва жыллём: на 2024 г. яна склала 30,4 м$^2$ на аднаго жыхара (для параўнання: у Расіі — 28,8 м$^2$ на аднаго чалавека, у Казахстане — 23,9 м$^2$). Ад 1991 да 2024 г. суверэнная Беларусь павялічыла свой жыллёвы фонд практычна ў 1,5 раза.

## ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ







У Рэспубліцы Беларусь рэалізуецца шэраг праграм, што прадугледжваюць дзяржаўную адрасную сацыяльную дапамогу людзям, якім патрэбная асаблівая сацыяльная абарона: малазабяспечаным грамадзянам, сем'ям, якія выхоўваюць малалетніх дзяцей, людзям старэйшага ўзросту і інвалідам.

1. *Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, падрыхтуйце паведамленне-прэзентацыю пра дзяржаўныя праграмы Рэспублікі Беларусь, накіраваныя на выдзяленне адраснай сацыяльнай дапамогі розным катэгорыям грамадзян.*
2. *Даведайцеся ад сваіх бацькоў, якія сацыяльныя выплаты атрымлівае ваша сям'я.*

### Узаемная адказнасць грамадзяніна і дзяржавы

У Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь замацаваная ўзаемная адказнасць грамадзяніна і дзяржавы: дзяржава адказная перад грамадзянінам за стварэнне ўмоў для свабоднага і годнага развіцця асобы; грамадзянін адказны перад дзяржавай за няўхільнае выкананне абавязкаў, ускладзеных на яго Канстытуцыяй. Кожны грамадзянін Рэспублікі Беларусь павінен праяўляць сацыяльную адказнасць, рабіць пасільны ўнёсак у развіццё грамадства і дзяржавы.

### Задачы і прынцыпы нацыянальнай сістэмы адукацыі

**2. Палітыка дзяржавы ў галіне адукацыі і аховы здароўя.** За гады суверэнітэту ў Рэспубліцы Беларусь сфарміравалася нацыянальная сістэма адукацыі, якая дазваляе рэалізаваць канстытуцыйнае права грамадзян на атрыманне адукацыі. Адукацыйныя

адносіны рэгулюе Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб адукацыі.

Ва ўстановах адукацыі рэалізуецца прынцып інклюзіі, згодна з якім роўны доступ да атрымання адукацыі маюць усе навучэнцы з улікам разнастайнасці індывідуальных адукацыйных патрэб і індывідуальных магчымасцей кожнага.

**Галоўныя задачы сістэмы адукацыі**

У Рэспубліцы Беларусь рэалізуецца прынцып «адукацыя праз усё жыццё». Асноўная адукацыя ўключае дашкольную, агульную сярэднюю, прафесійна-тэхнічную, сярэднюю спецыяльную, вышэйшую і навукова арыентаваную.

**Узроўні асноўнай адукацыі**

Кожнае дзіця ва ўзросце ад 1 да 6 гадоў мае магчымасць атрымліваць якасную бясплатную дашкольную адукацыю. Дзіцячыя дашкольныя ўстановы наведваюць каля 90 % дзяцей, гэта адзін з найвышэйшых узроўняў ахопу малых дашкольнай адукацыяй сярод краін СНД. 100 % дзяцей 5-гадовага ўзросту ахопленыя падрыхтоўкай да школы.

Сучасны чалавек павінен няспынна вучыцца. Ці згодныя вы з гэтым меркаваннем? Сваю думку растлумачце.

Агульная сярэдняя адукацыя ў краіне з'яўляецца абавязковай. Паспяхова скончыўшы базавую школу (I–IX класы), маладыя людзі маюць магчымасць працягнуць навучанне ў каледжах, дзе адначасова атрымліваюць агульную сярэднюю адукацыю і прафесійную падрыхтоўку. У каледжах краіны ажыццяўляецца падрыхтоўка па 200 прафесіях на ўзроўні прафесійна-тэхнічнай адукацыі, па 200 спецыяльнасцях на ўзроўні сярэдняй спецыяльнай адукацыі.

Агульную сярэднюю адукацыю можна атрымаць і ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі, дзе ў X–XI класах уведзена профільнае навучанне: навучэнцы могуць вывучаць асобныя вучэбныя прадметы на павышаным узроўні. У старшых класах адкрытыя таксама класы прафесійнай накіраванасці. Выпускнікі гэтых класаў маюць магчымасць паступаць у ВНУ на зацверджаны пералік спецыяльнасцей без экзаменаў.

Вышэйшая адукацыя ў рэспубліцы з’яўляецца прэстыжнай і даступнай. Паводле колькасці студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў на 10 тыс. насельніцтва Беларусь з’яўляецца адным з лідараў у Еўропе і свеце. Выпускнікам гарантуецца атрыманне першага рабочага месца шляхам размеркавання. Маладыя спецыялісты, што працуюць па размеркаванні, маюць шэраг сацыяльных гарантый.

У развіцці сістэмы вышэйшай адукацыі найважнейшым прынцыпам з’яўляецца інтэграцыя адукацыі, навукі і вытворчасці. На прадпрыемствах рэспублікі, у інстытутах Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі дзейнічаюць філіялы кафедраў устаноў вышэйшай адукацыі. У іх працуюць навукова-тэхналагічныя паркі, галіновыя лабараторыі, студэнцкія навукова-даследчыя аб’яднанні. Для забеспячэння сувязі ўстаноў вышэйшай адукацыі з заказчыкамі кадраў у ВНУ арганізаваны прыём абітурыентаў па мэтавым накіраванні ад прадпрыемстваў, устаноў, арганізацый.




*Нацыянальны дзіцячы тэхнапарк. Г. Мінск*

У краіне створаная сістэма падтрымкі таленавітай і адоранай моладзі. Па ініцыятыве А. Р. Лукашэнкі ад 1996 г. функцыянуюць спецыяльныя фонды Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі, сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў. У 2021 г. створаны Нацыянальны дзіцячы тэхнапарк. Штогод у ім праходзяць навучанне звыш 1500 навучэнцаў па 15 сучасных кірунках, сярод іх «Авіякасмічныя тэхналогіі», «Біятэхналогіі», «Нанаіндустрыя і нанатэхналогіі» і інш.

Беларуская адукацыя запатрабаваная і ў іншых краінах. У 2010 г. у нашай краіне навучалася каля 10 тыс. замежных грамадзян, у 2025 г. — больш за 35 тыс. са 110 дзяржаў.

## Права на ахову здароўя

Канстытуцыя гарантуе грамадзянам Рэспублікі Беларусь права на ахову здароўя, у тым ліку на бясплатнае лячэнне за кошт дзяржаўных сродкаў у парадку, устаноўленым законам. Пры гэтым грамадзяне мусяць клапаціцца пра захаванне ўласнага здароўя.

Гэты абавязак прадугледжаны Канстытуцыяй. Дзяржава стварае ўмовы для даступнага ўсім грамадзянам медыцынскага абслугоўвання.

Для забеспячэння канстытуцыйных гарантый на ахову здароўя грамадзян прынцыпова важнае значэнне мела рашэнне Кіраўніка дзяржавы аб захаванні бюджэтнага фінансавання аховы здароўя. Наша рэспубліка — адна з нямногіх краін постсавецкай прасторы і еўрапейскага рэгіёна, дзе яно захавалася. На забеспячэнне сістэмы аховы здароўя з дзяржаўнага бюджэту выдзяляецца больш за 4 % ВУП, што адпавядае рэкамендацыям Сусветнай арганізацыі аховы здароўя і прадугледжана Канцэпцыяй нацыянальнай бяспекі Рэспублікі Беларусь.

**Беларуская медыцына ў свеце**

Наша краіна ўваходзіць у лік сусветных лідараў паводле ўзроўню развіцця медыцыны і аховы здароўя. Дзеючая сістэма дзяржаўных мінімальных сацыяльных стандартаў дазваляе аказваць медыцынскую дапамогу ў роўнай ступені гарадскому і вясковаму насельніцтву.

Прыярытэты і асноўныя кірункі дзяржаўнай палітыкі ў сферы аховы здароўя Рэспублікі Беларусь

## ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ

**З выступлення Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнкі на пленарным пасяджэнні, прысвечаным урачыстаму адкрыццю 26-й штогадовай сесіі Парламенцкай Асамблеі АБСЕ**

«Наша дзяржава ўвайшла ў лік сусветных лідараў паводле ўзроўню развіцця аховы здароўя і медыцыны. Кожны грамадзянін незалежна ад даходаў мае магчымасць бясплатна атрымаць усякі від медыцынскай дапамогі, у тым ліку самай высокатэхналагічнай».

1. *Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, складзіце топ-5 дасягненняў сучаснай беларускай медыцыны. Аргументуйце свой выбар.*
2. *Досвед беларускай сістэмы аховы здароўя аказаўся эфектыўны ва ўмовах пандэміі COVID-19. Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, падрыхтуйце паведамленне-прэзентацыю аб перавагах беларускай медыцыны ў барацьбе з пандэміяй.*

адлюстраваныя ў Стратэгіі навукова-тэхнічнага і інавацыйнага развіцця аховы здароўя Рэспублікі Беларусь на 2021–2025 гг. і на перыяд да 2040 г.

**Арганізацыя медыцынскай дапамогі маці і дзецям**

Галоўнай мэтай сістэмы аховы здароўя краіны выступае фарміраванне здаровай нацыі, захаванне здароўя насельніцтва. Вялікая ўвага ўдзяляецца арганізацыі медыцынскай дапамогі маці і дзецям. Рэспубліка займае 25-ю пазіцыю ў рэйтынгу самых камфортных для мацярынства краін свету, апярэдзіўшы многія краіны ЕС і нават ЗША, якія займаюць 33-е месца.

**Медыцынскія паслугі замежным грамадзянам**

Беларускія медыкі выконваюць самыя складаныя аперацыі па мікрахірургіі вока, пратэзаванні суставаў, перасадцы печані, нырак, касцявога мозгу, сэрца і лёгкіх і іншыя высокатэхналагічныя аперацыі. Магчымасць атрымаць якасную медыцынскую дапамогу і прайсці рэабілітацыю прываблівае замежных грамадзян. У 2024 г. беларускія дактары аказалі медыцынскія паслугі больш чым 160 тыс. замежнікаў са 159 краін, у тым ліку Расіі, Кітая, Казахстана, Узбекістана, Туркменістана, Літвы, Латвіі, Ізраіля, Босніі і Герцагавіны, Сербіі, ЗША, Грузіі.

Правы грамадзян Рэспублікі Беларусь на ахову здароўя забяспечваецца таксама развіццём фізічнай культуры і спорту, захадамі па аздараўленні навакольнага асяроддзя, магчымасцю карыстання аздараўленчымі ўстановамі, удасканаленнем аховы працы.

**Канстытуцыйнае замацаванне дзяржаўнай падтрымкі інстытута сям'і**

### 3. Дзяржаўная падтрымка інстытута сям'і.

У Рэспубліцы Беларусь падтрымка інстытута сям'і з'яўляецца нацыянальным прыярытэтам. У Асноўным Законе дзяржавы замацавана, што шлюб як саюз жанчыны і мужчыны, сям'я, мацярынства, бацькоўства і дзяцінства знаходзяцца пад абаронай дзяржавы; сужэнцы маюць роўныя правы ў шлюбе і сям'і; дзяржава забяспечвае прыярытэт выхавання дзяцей у сям'і, аказвае падтрымку сем'ям з дзецьмі, дзецям-сіротам і дзецям, якія засталіся без апекі бацькоў.

У 1998 г. Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнкі былі зацверджаны «Асноўныя кірункі дзяржаўнай сямейнай палітыкі». За тры дзесяцігоддзі сфарміравалася сістэма дзяржаўнай дапамогі сям'і.

**Падтрымка шматдзетных сем'яў**

У краіне рэалізуецца шэраг захадаў, накіраваных на падтрымку шматдзетных сем'яў. Гэта выплаты дапамог у сувязі з нараджэннем і выхаваннем дзяцей, прадастаўленне сямейнага капіталу шматдзетным сем'ям, сацыяльнае абслугоўванне сем'яў з дзецьмі, дзяржаўная падтрымка ў будаўніцтве жылля.

**Дапамогі па доглядзе дзіцяці**

Згодна з Законам Рэспублікі Беларусь «Аб дзяржаўных дапамогах сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей» дапамогу па доглядзе дзіцяці выплачваюць да дасягнення ім 3 гадоў. Гэта самы працяглы адпачынак сярод краін свету. На заканадаўчым узроўні сям'і дадзена права самастойна вызначаць, хто з працуючых бацькоў будзе ажыццяўляць догляд дзіцяці і знаходзіцца ў такім адпачынку. Усталяваныя памеры аднаразовых дапамог: пры нараджэнні першага дзіцяці — 10 бюджэтаў пражытачнага мінімуму, пры нараджэнні другога і наступных дзяцей — 14.

**Праграма «Сямейны капітал»**

Падтрымка шматдзетных сем'яў ажыццяўляецца ў рамках праграмы «Сямейны капітал», якая дзейнічае ад 2015 г. і прадугледжвае аднаразовую выдачу сем'ям безнаяўных грашовых сродкаў пры нараджэнні (усынаўленні, удачарэнні) трэцяга і наступнага дзіцяці. Права на распараджэнне сямейным капіталам даецца па заканчэнні 18 гадоў ад даты нараджэння дзіцяці, у сувязі з нараджэннем (усынаўленнем, удачарэннем) якога сям'я атрымала права на яго прызначэнне.

У Рэспубліцы Беларусь на дзяржаўным узроўні высока цэняць працу шматдзетнай маці, якая годна выхавала пяць і болей дзяцей: заснаваная дзяржаўная ўзнагарода — ордэн Маці, якім узнагароджаны больш за 13,4 тыс. беларускіх маці.



*Ордэн Маці*

## ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ




*1. Выкарыстоўваючы ілюстрацыю, разлічыце сярэдні памер дэпазітнага рахунку сямейнага капіталу.*

*2. Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, даведайцеся, у якіх выпадках сямейны капітал можа быць выкарыстаны датэрмінова.*

*3. На якія мэты найчасцей датэрмінова выкарыстоўваюць сямейны капітал?*

**Права на працу**

**4. Рынак працы.** Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь гарантуе грамадзянам права на працу як найбольш годны спосаб самасцвярджэння чалавека, права на выбар прафесіі, роду заняткаў і працы ў адпаведнасці з пакліканнем, здольнасцямі, адукацыяй, прафесійнай падрыхтоўкай і з улікам грамадскіх патрэб, а таксама на здаровыя і бяспечныя ўмовы працы.

**Палітыка дзяржавы ў галіне занятасці насельніцтва**

Забеспячэнне эфектыўнай занятасці насельніцтва, фарміраванне кадравага патэнцыялу з улікам рэальных патрэб вытворчасці, забеспячэнне сацыяльнай падтрымкі часова не занятага насельніцтва — важныя кірункі сацыяльнай палітыкі рэспублікі.

Дзяржава стварае ўмовы для поўнай занятасці насельніцтва. У 2024 г. увайшла ў сілу новая рэдакцыя Закона «Аб занятасці насельніцтва Рэспублікі Беларусь». Яго дзеянне накіраванае на стварэн-

не ўмоў для развіцця і падтрымкі высокай матывацыі беспрацоўных да актыўнага пошуку працы і ўзмацненне ролі наймальнікаў на рынку працы.

Узровень беспрацоўя ў нашай краіне — адзін з самых нізкіх у свеце. Адначасова ў Беларусі існуе ўстойлівы попыт на рабочую сілу.

**Падтрымка прадпрымальніцкай ініцыятывы**

Адным з важных кірункаў палітыкі ў галіне садзеяння занятасці насельніцтва выступае падтрымка прадпрымальніцкай ініцыятывы грамадзян — беспрацоўным аказваюць фінансавую падтрымку на бязвыплатнай і беззваротнай аснове для пачатку прадпрымальніцкай і рамесніцкай дзейнасці, дзейнасці па аказанні паслуг у галіне аграэкатурызму.

**Стымуляванне працоўнай мабільнасці**

У мэтах садзеяння занятасці беспрацоўных грамадзян і забеспячэння наймальнікаў работнікамі рэалізуюцца захады па стымуляванні працоўнай мабільнасці грамадзян. Пры жаданні беспрацоўнага ажыццяўляецца садзеянне ў перасяленні яго і членаў яго сям’і на новае месца жыхарства і працы.

**Дзяржаўная маладзёжная палітыка**

**5. Асновы маладзёжнай палітыкі.** Важным кірункам сацыяльнай палітыкі беларускай дзяржавы з’яўляецца падтрымка моладзі. З ініцыятывы Кіраўніка дзяржавы распрацаваная дзяржаўная маладзёжная палітыка — сістэма сацыяльных, эканамічных, палітычных, арганізацыйных, прававых і іншых захадаў, накіраваных на падтрымку маладых грамадзян, іх станаўленне і развіццё, найбольш поўную рэалізацыю іх патэнцыялу ў інтарэсах усяго грамадства.

У Беларусі маладых людзей актыўна ўцягваюць у прыняцце і рэалізацыю кіраўніцкіх рашэнняў, што датычацца жыцця і дзейнасці моладзі, абароны яе правоў і інтарэсаў. Пры Савеце Рэспублікі і Палаце прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь дзейнічаюць маладзёжныя саветы.

Пры Міністэрстве адукацыі дзейнічае кансультацыйна-дарадчы орган — Савет маладых вучоных.

**Кірункі маладзёжнай палітыкі Рэспублікі Беларусь**

**Садзеянне рэалізацыі права моладзі на працу**

- Забеспячэнне гарантаванага першага працоўнага месца маладым спецыялістам;
- працаўладкаванне студэнтаў і навучэнцаў;
- падтрымка руху студэнцкіх атрадаў;
- развіццё сістэмы цэнтраў занятасці і прафарыентацыі моладзі;
- стварэнне неабходных умоў працы, побыту і адпачынку для моладзі, якая працуе на вёсцы і ў малых гарадах (маладым спецыялістам даюць жыллё, стымулююць маладзёжнае прадпрымальніцтва і фермерства)

**Падтрымка маладых сем'яў**

- Выплата дапамогі маладым сем'ям з дзецьмі;
- выдача субсідый і доўгатэрміновых ільготных крэдытаў маладым сем'ям для будаўніцтва жылля

**Сацыяльная падтрымка адоранай моладзі**

Маладыя людзі, якія маюць пэўныя дасягненні ў вучобе, спорце, грамадскай дзейнасці, атрымліваюць ільготы пры паступленні ва ўстановы вышэйшай адукацыі, стыпендыі, у тым ліку са спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў, спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі

**Грамадскі рэспубліканскі студэнцкі савет**

У Рэспубліцы Беларусь створаны Грамадскі рэспубліканскі студэнцкі савет, у які ўваходзяць старшыні студэнцкіх саветаў устаноў вышэйшай адукацыі краіны.

**Валанцёрскі рух**

У Беларусі развіваецца маладзёжны валанцёрскі рух — добраахвотная дзейнасць, якая ажыццяўляецца на бязвыплатнай аснове і накіраваная на аказанне дапамогі розным сацыяльным групам. Удзельнікі валанцёрскіх атрадаў навучаюць равеснікаў асновам здаровага ладу жыцця, аказваюць дапамогу пажылым людзям і інвалідам, удзельнічаюць у правядзенні адукацыйных акцый, мерапрыемстваў.

*Рэспубліка Беларусь, нягледзячы на выклікі звонку, нязменна рушыць абраным курсам, застаецца сацыяльна арыентаванай дзяржавай, праводзіць актыўную сацыяльную палітыку, накіраваную на павышэнне ўзроўню і якасці жыцця насельніцтва. Галоўнай мэтай сацыяльнай палітыкі выступае наданне кожнаму працаздольнаму чалавеку магчымасці сваёй працай і прадпрымальнасцю стварыць свой сямейны дабрабыт, а непрацаздольным і незаможным грамадзянам — надзейнай сацыяльнай абароны.*

*Рэспубліка Беларусь уваходзіць у лік сусветных лідараў паводле ўзроўню развіцця аховы здароўя і медыцыны. Наша краіна — адна з нямногіх краін постсавецкай прасторы і еўрапейскага рэгіёна, дзе захаваная бюджэтная сістэма фінансавання аховы здароўя.*

**калі ў свеце…**

У Францыі аплатны адпачынак па доглядзе дзіцяці складае 4 месяцы

**на тэрыторыі Беларусі…**

У Рэспубліцы Беларусь аплатны адпачынак па доглядзе дзіцяці складае 3 гады

**ПЫТАННІ І ЗАДАННІ**

1. Назавіце прыкметы сацыяльна арыентаванай дзяржавы. Дакажыце, што Рэспубліка Беларусь з'яўляецца сацыяльна арыентаванай дзяржавай.
2. Што значыць прынцып «адукацыя праз усё жыццё»?
3. Ахарактарызуйце асноўныя кірункі дзяржаўнай палітыкі ў галіне аховы здароўя.
4. Складзіце тэзісны план адказу пра сацыяльную палітыку Рэспублікі Беларусь, накіраваную на падтрымку інстытута сям'і.
5. Прааналізуйце сацыяльную палітыку беларускай дзяржавы па спрыянні занятасці насельніцтва. Якія вынікі яе рэалізацыі?
6. Ахарактарызуйце асноўныя кірункі маладзёжнай палітыкі Рэспублікі Беларусь. Канкрэтызуйце іх фактамі.